**Літаратура**

1. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.
2. Васючэнка, П.В. Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм / П.В. Васючэнка. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 155 с.
3. Грынчык М.М. "Ў вечным боры…" / М.М. Грынчык // Янка Купала: энцыклапед. даведнік / БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 604.
4. Купала, Я. Ў вечным боры… // Поўны збор твораў: у 9 т. – Т. 3: Вершы, пераклады 1911–1914 / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – С. 54.
5. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. – Т. 6: Паэмы. Пераклады / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 430 с.
6. Купала, Я. Чаму плача песня наша? // Поўны збор твораў: у 9 т. – Т. 8: Артыкулы, нататкі, выступленні. Калектыўныя творы / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 2002. – С. 2–28.
7. Санько, С. Плачка / С. Санько // Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 163–166.
8. Хаўстовіч, М.В. Паэт і казачнік з азёрнага краю / М.В. Хаўстовіч // Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – С. 5–28.

***А. А. Любчанка***

# ПРАЯВЫ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЙ ФІЛАСОФІІ Ў АПАВЯДАННІ ЯКУБА КОЛАСА «КРЫВАВЫ ВІР»

Апавяданне Якуба Коласа "Крывавы вір" прысвечана мастацкаму асэнсаванню наступстваў рэвалюцыі. Рэвалюцыя паўстае як "стыхія, яна выклікае буру пачуццяў, уносіць сумятню ў настрой, разводзіць у супрацьлеглыя бакі людзей, дзейнічае дэструктыўна" [с. 228], палярызуе грамадства, выклікае супрацьстаянне і напружанне. У творы Колас апісвае адразу некалькі супрацьстаянняў, якія адбываліся ў нестабільныя рэвалюцыйныя і пострэвалюцыйныя часы: сяляне выступаюць супраць паноў, актыўныя рэвалюцыянеры – супраць "контррэвалюцыянераў".

Героі апавядання, апынуўшыся ў падобным становішчы, мусілі рабіць экзістэнцыяльны выбар, бо чаканне лепшага жыцця "на памежжы" пагражала смерцю. Кожны з герояў з'яўляецца адлюстраваннем пэўнай грамадскай пазіцыі. Так, дзед Патап добра памятае панскую крыўду, але нягледзячы на ўвесь боль, не ставіцца агрэсіўна да былых гаспадароў. Ён стварае ўражанне нявызначанага, крыху баязлівага традыцыяналіста, які верыць у прыкметы і не ведае, чаго сапраўды чакаць ад рэвалюцыі. Дзед Патап асцярожна паводзіць сябе на вясковых сходах – толькі прыслухоўваецца, але не выказваецца.

Выказваюцца на сходах іншыя жыхары вёскі: Рыгор, Міхейчык, якія актыўна выносілі ўсё каштоўнае з панскіх дамоў. Тым не менш яны адмаўляюцца прызнаваць сваю адказнасць за ўсеагульнае марадзёрства. На іх думку, яны дзейнічаюць толькі за сябе, аднак, згодна з экзістэнцыяльнай філасофіяй, адзінка – гэта адлюстраванне масы. Таму кожны, хто бярэ ўдзел у падобных акцыях, аўтаматычна бярэ на сябе адказнасць за хвалю марадзёрства ў вёсцы. Праблема такіх людзей, як Міхейчык, якімі рухаюць старыя крыўды, у неразуменні свайго рэальнага ўплыву на народ. Ім падаецца, што кожны прадстаўнік панскага роду

павінен аддаць усё, яны не бачаць у былых панах звычайных людзей з іх страхамі і жаданнем жыць.

Гаспадыня маёнтка апанавана страхам: "Ёй страшна, страшна, старой пані. Яна пачула, што нейкія варожыя сілы націскаюцца з усіх бакоў, як-бы на яе наступала бурлівае мора, каб зьмесьці яе і пахаваць у цемры свайго бяздоньня" [1, с. 41]. Страх старой адлюстроўваецца ва ўсім яе атачэнні: "Яна бачыла вакол сябе цёмны вір, які немінуча зацягне ў сябе яе жыццё. <...> Кожны крык на вуліцы, кожная чалавечая фігура веялі на яе подыхам сьмерці" [1, с. 41].

Пані настолькі баіцца агрэсіі з боку вяскоўцаў, што думае пра вайну, як пра "сонейка свяцілы". Яна ўпэўнена, што немцы, якія знаходзяцца недзе на мяжы, могуць уратаваць яе ад сялянскай расправы. Напужанай жанчыне не застаецца нічога, акрамя чакання і надзей на Бога або на чужых салдат – рэлігійная вера прымушае яе спадзявацца. Такім чынам, яна поўнасцю аддае сваю экзістэнцыю пад уладу выпадку і вышэйшых сіл.

Унук старой пані Грыша не падзяляе яе страху, прытрымліваецца супрацьлеглых поглядаў, чым яшчэ больш пужае бабулю. Хлопец прыняў бок сялян, быў прыхільнікам рэвалюцыі, летуценнікам. Ідэі рэвалюцыі прываблівалі яго на адлегласці, Грыша апраўдваў жорсткасць сялян тым, што самі паны ўласнымі дзеяннямі ў мінулым справакавалі гэтую жорсткасць, наклалі на сябе "праклянцце". "– Ах, бабуня, калі находзіць навальніца, то яна не разьбірае, дзе палын горкі і дзе пшаніца. Такі ўжо яе закон. Рэволюцыя – тая-ж самая навальніца. Хто вінаваты? Ніхто і ўсе" [1, с. 44–45], – так студэнт выказваў свае радыкальныя, падобныя да экзістэнцыяльных, ідэі.

Далейшае сутыкненне з рэальнасцю, прымусіла яго засумнявацца ў гэтых перакананнях. Грыша вельмі не хацеў апынуцца ў стане немцаў, аднак аказалася, што быць у стане сваіх не менш небяспечна. Хлопец трапіў у экзістэнцыяльную памежную сітуацыю, якая перавярнула яго пазіцыю і паказала яго сапраўдны твар. Сяляне ставіліся да Грышы з недаверам, і хлопец, як і пані, пачаў баяцца іх сілы, асабліва калі даведаўся пра забойства сваяка з панскага роду, што таксама "любіў просты люд". Забойства дзядзькі нібы ацвярэзіла яго, паказала страшную моц, закладзеную ў стыхійных дзеяннях рэвалюцыйна настроеных сялян. Для іх ужо няма людзей, ёсць толькі рэвалюцыянеры, ваяры і іх ворагі, да якіх прыпісалі ўсіх – і паноў, і немцаў. Супраць апошніх жыхары вескі вельмі хутка мабілізаваліся, што яшчэ раз пацвердзіла сілу ідэі, якой кожны чалавек давярае сваё жыццё і якая пераўтварае яго ў частку цэлага, пазбаўляючы магчымасці ўласнага асэнсаванага выбару. Такім чынам, не толькі адзінкі ўплываюць на цэлае, але і маса схіляе адзінку на свой бок у адно імгненне, без паўзы на экзістэнцыяльныя роздумы. Таму "мабілізацыя прайшла бордза", а Грыша, які спужаўся быць забітым і ўжо ўцякаў, вымушаны быў пайсці з сялянамі, што сустрэліся яму па дарозе і ледзь не збілі яго на месцы.

Ідучы з аднавяскоўцамі, Грыша адчуў усю экзістэнцыяльную адзіноту свайго становішча. Адчуванне небяспекі і страх смерці не давалі спакою, ціск масы не змог пазбавіць Грышу гэтых пачуццяў. Жыццё стала дарагім, як ніколі. У адрозненне ад іншых, хлопец не разумеў, нашто яму зараз ісці на смерць. Ён не быў упэўнены і ў матывах іншых: "Што-ж прымушала іх пайсьці? Сьвядомасьць доўгу?

Свае асабовыя інтарэсы?” [1, с. 50]. “Асабовым інтарэсам” Грышы было яго ўласнае жыццё, таму ён прыняў рашэнне ўцячы. Ён доўга бег, але яго знайшлі жыхары іншай вёскі, у якой знаходзіліся і яго аднавяскоўцы, уключаючы нядаўна мабілізаваных хлопцаў і дзеда Патапа. Менавіта ў гэтай сітуацыі дзеду Патапу і даводзіцца рабіць экзістэнцыяльны выбар: ён наўмысна не прызнае Грышу, якога збіваюць, а потым і забіваюць. Гэтым выбарам дзед фактычна далучыўся да крывавага віру рэвалюцыі, прыняў яе разбуральную ўладу.

У творы важную мастацкую функцыю выконваюць пейзажныя апісанні: “прыветная прырода” ў апавяданні адлюстроўвае спакой і раўнавагу. Як і ў экзістэнцыяльнай філасофіі, прырода абыякавая да трыгедый, якія адбываюцца па-за ёй, яна не рэагуе на жыццё чалавека, можа “радавацца” і заставацца такой жа “прыветнай”, калі льецца кроў. Такое ж становішча адносна чалавека займае гісторыя. У апавяданні “Крывавы вір” паўстае праблема значнасці індывідуума ў гістарычным працэсе. Твор Коласа схіляе да роздумаў над сэнсам (важнасцю ці поўнай бессэнсоўнасцю) смерці Грышы як адзінкі, якая адмовілася аддаць жыццё за агульную справу.

Кожны гістарычны перыяд мае сваю справядлівасць, і справядлівасць рэвалюцыі ці вайны адрозніваецца ад справядлівасці мірнага перыяду. Тым не менш, кожны чалавек мае права на самавызначэнне, і вышэйшай несправядлівасцю можна з упэўненасцю назваць пазбаўленне чалавека – з уласнымі выбарамі, уласнымі страхамі і трывогамі – жыцця. Экзістэнцыялізм ставіць чалавечую свабоду на першае месца, але гістарычны працэс не заўважае гэтага. Таму ў пэўных сітуацыях выбар адзінкі не значыць нічога, калі ён не стасуецца з агульным духам адпаведнага часу, і калі “сціраецца мяжа паміж чалавекам і зверам”.

**Літаратура**


1. Колас, Я. (Гушча, Т.). На рубяжы / Я. Колас. – Менск : Дзяржвыд. Беларусі, 1925. – 56 с.
2. Тычына, М. А. Якуб Колас / М. А. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – Т. 1 : 1901–1920 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – 3-е выд. – 2003. – С. 176–236.



*Д. А. Молчанова*


## ОСОБЕННОСТИ ТЕКСТА ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ В ПОЭЗИИ ЯНКИ КУПАЛЫ: «ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ КРЫЎДА»

Белорусская земля в силу своего географического положения на протяжении нескольких столетий не единожды оказывалась втянутой в чужие военные конфликты. Войны и восстания 18 – 19 вв. научили белоруса горькой правде: добыть свободу кровью и ценой человеческой жизни невозможно. Эту же мысль Янка Купала последовательно воплотил в цикле стихотворений «Песні вайны» [1, с. 210-218] и других стихотворениях, которыми он откликнулся на Первую мировую войну.

Цикл открывает стихотворение «Варожбы». Ведущим в стихотворении является образ вербы, который в контексте символизирует встревоженную,